УДК 882.6.09-1

**І. І. Шматкова**

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ ВОБРАЗЫ І МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТЭС ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX ст.

Исследуется воплощение христианских образов и мотивов в творчестве белорусских поэтесс второй половины XX в. (Я. Янищиц, Н. Матяш, Т. Бондарь, Г. Корженевской и др.). В лирике рассматриваемых авторов воплощено понимание того, что христианская вера является источником нравственного совершенствования и духовного обогащения, в их произведениях есть искренние обращения к Богу, жанр стихотворения-молитвы.

*Ключевые слова:* поэзия, белорусские поэтессы, христианские образы, вера, духовность, нравственность.

У беларускай літаратуры хрысціянская традыцыя мае глыбокія карані. З часоў асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны ў беларускай літаратуры дамінуе галоўная ідэя Бібліі – любові да бліжняга. «Гэта думка ў Новым Запавеце «Бібліі», – адзначае В. Жураўлёў, – з’яўляецца лейтматыўнай, акумулюе і падпарадкоўвае ўсе іншыя сэнсавыя лініі, як убірае ў сваё рэчышча магутная рака ўсе яе малыя і вялікія прытокі» [1, с. 34].

Ф. Скарына ў адной са сваіх прадмоў да кніг Бібліі пісаў: «...То чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хацеши от иных имети» [2, с. 109]. Гэта традыцыя была працягнута ў творчасці Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Афанасія Філіповіча (дарэчы, нездарма менавіта да яго звяртаецца ў адным са сваіх вершаў Н. Мацяш), Сімяона Полацкага, Адама Міцкевіча і інш.

Выклікаюць цікавасць меркаванні беларускіх навукоўцаў пра рэлігійнасць беларускай нацыі. А. Века суадносіць дзве процілеглыя думкі. Адны даследчыкі, вылучаючы ў беларускім менталітэце талерантнасць, спагадлівасць [3, с. 259–262], сцвярджаюць, што «беларусы – самыя паслядоўныя хрысціянскія падзвіжнікі» [4, с. 34]. Другія ж даследчыкі, наадварот, лічаць, што ўсе беды беларусаў з-за «недастатковай хрысціянскасці» [5, с. 272–279]. Што тычыцца беларускай літаратуры XX стагоддзя, то тут свой адбітак зрабіла гісторыя развіцця грамадства. Пасля 1917 года вера была пад забаронай, разбураліся цэрквы (Г. Каржанеўская «Бурылі цэрквы...»). Спатрэбіўся час, каб людзі апамяталіся, павярнуліся да Бога. Пачалося духоўнае адраджэнне. Зноў давялося «выклікаць майстроў – // Рэстаўраваць усѐ, // што не ўзарвалі» [6, с. 6]. Так, храмы адбудоўваем, а вось храм душы адрэстаўраваць значна цяжэй.

Нездарма ў лірыцы беларускіх паэтэс другой паловы XX стагоддзя так ярка выявілася імкненне выратаваць людзей ад бездухоўнасці, дэгуманізацыі. Найбольш складана гэта было зрабіць К. Буйло, Э. Агняцвет, Е. Лось, бо яны жылі і тварылі ў тую савецкую эпоху, калі слова Божае было пад забаронай. Ім належыла быць прыкладнымі камуністкамі, як таго патрабаваў час. Нягледзячы на агульную гуманістычную дамінанту творчасці, услаўленне агульначалавечых каштоўнасцей, ѐсць у іх паэзіі і атэістычныя творы. Напрыклад, у «Касмічным трыпціху» (верш «Заместа бога...») Е. Лось параўноўвае касманаўта з богам у небе. Такое параўнанне якраз і характарызуе тую эпоху. Е. Лось

змагла прызнацца ў адсутнасці веры: «Няма яе!» – не раз калі // і я сабе казала, // і крыўда ледзь не да зямлі // мне плечы прыгінала» [7, с. 277]. У гэтых радках чуецца раскаянне. І сапраўды, які б ні быў час, заўсёды знаходзіліся добрыя людзі, якія, можа, і не білі сябе ў грудзі, што яны вернікі, затое жылі па хрысціянскіх законах: «Але заўжды, каб знішчыць здзек // з нявіннага давер'я, // з'яўляўся шчыры чалавек, // з'яўляўся добры чалавек, // з'яўляўся просты чалавек – // проста чалавек, – // і гінула нявер'е!» [8, с. 277]. Паўтор слова «чалавек» яшчэ раз акцэнтуе ўвагу на высокагуманістычным пафасе лірыкі паэтэсы.

Рэлігійнасць значна глыбей выявілася ў «жаночай» паэзіі маладзейшага пакалення: Н. Мацяш, Т. Бондар, Р. Баравіковай, Г. Каржанеўскай і інш. У вершы «Голас чацвёртай» Н. Мацяш імкнецца да аднаго: «Хацелася аднаго ад долі: // Душою з небам гаварыць» [9, с. 154]. У вершы «Сузямельцы» паэтэса дакарае сваіх суайчыннікаў за баязлівасць і бязвер'е: «Вы і цяпер, як некалі, // Не так Бога баіцеся, // Як начальніка!» [10, с. 196]. Яна ўслаўляе «Уменне жыць не ў спаняверцы // У сэнсе земнага жыцця, // Уменне вераваць да смерці // У бессмяротны свой працяг!» [9, с. 212]. Н. Мацяш заклікае сваё сэрца да веры: «Замацуй у глыбінях сваіх // Знакам веры ў жыццё гэты міг» [9, с. 225]. Сапраўды, захаваць веру ў сэрцы – для чалавека вельмі нялёгкая задача, гэта патрабуе пастаянных намаганняў, працы над сабой. Лірычная гераіня Н. Мацяш змагаецца са сваёй недасканаласцю, просіць Усявышняга «не зацеміць свядомасць // Сумненнем! // Хоць бы зноў не сарвацца // У прорву зняверы! // Промнік Ісціны, // <...> Быць відушчай, // Быць памкнёнай толькі да вечнага – // Памажы!» [9, с. 228].

Чалавек сам па сабе – слабая і недасканалая істота, якая не заўсёды здольна вытрымаць выпрабаванні. Гэта яскрава паказала літаратура экзістэнцыялізму. Магчымасці чалавека не бязмежныя. У вершы «Што ацяміць?» Н. Мацяш прыгадвае знакамітыя словы «Няма дасканаласці ў свеце», выказаныя французскім пісьменнікам Антуанам дэ Сент-Экзюперы, каб далей сказаць пра

сучасны стан грамадства: «Людзі адварочваюцца ад Бога, // Бо не бачаць, каб Ķн пакараў вінаватага // За забойства, ці гвалт, ці бяздушша. // А Бог у душы знябыты» [9, с. 240].

Знаходзячыся ў такім асяродку, лірычная гераіня апынулася ў разгубленасці: «Адвярнуліся святыя! // Ці не так, як трэба, клікала...» [9, с. 233]. І як вынік чуем запытанне: «Хіба Гасподзь сцярпець бы змог, // Калі б ѐн існаваў на свеце – Бог?!» [9, с. 291]. Што гэта: сумненне, роспач? Не, паэтэса трывожыцца, што на зямлі ўзвысіўся чалавек, які ўявіў сябе чалавекабогам: «Бо мерай усяго ѐсць чалавек: // Сам вершыць суд, сам творыць цуд і здзек» [9, с. 291]. Як зазначае М. Бярдзяеў, «любіць чалавека, калі няма Бога, – значыць чалавека шанаваць за Бога. І тады падсцерагае чалавека вобраз чалавекабога, які павінен паглынуць чалавека, пераўтварыць яго ў сваю зброю. Так немагчымай з’яўляецца любоў да чалавека, калі няма любові да Бога» [11, с. 327]. Гэту праблему няпэўнасці чалавека ўздымае Н. Мацяш у вершы «Неўнікнѐнасць». Паэтэсе шкада людзей, што заблукалі, страцілі праведны шлях: «Няпэўны час, // Няпэўная душа. // Зацемраных людзей нясцерпна шкода... // Святое Слова, што было спярша, // Не як любоў у іх, // А як выгода» [9, с. 236].

Р. Баравікова таксама «агаляе» шматлікія чалавечыя грахі: «А людзі... // Годнасць страчана ў адных, // бунтуе ў іншых гордая парода...» [12, с. 219], «Хлуслівы не прызнаецца ў хлусні, // ѐн, можа, і не знае, што хлуслівы...» [12, с. 219], адным словам, – «Жыццѐ – тартак, // пілуе нервы час, // адчай, мана і здрада...» [13, с. 192]. Адпаведна хрысціянскай традыцыі, лірычная гераіня Р. Баравіковай усѐ злое бачыць як праяўленне д’яблаўскіх сіл, добрае – боскіх; праблема ў тым, ці знойдзецца той чалавек-прарок, які дапаможа знайсці правільны шлях: «Шалее д’ябал ад сваіх забаў, // не абмінае гэты шал нікога... // Дзе той відушчы, хто б руку падаў, // у ім гатовы свет пабачыць Бога» [12, с. 229]. Таксама па-хрысціянску паэтэса разважае аб часовасці жыцця чалавека на зямлі: «Хай цела – тлен... // Ад тлену не прыбудзе, // ды вырвецца калісь на волю дух!» [12, с. 224]. У сваіх вершах

Р. Баравікова дэманструе нацыянальную адметнасць беларусаў, выражаную праз спалучэнне хрысціянскай і язычніцкай традыцый, калі народнае суадносіцца з вышэйшым – горнім, сакральным: «Вунь поўні белая ладдзя // святлом у сум мой уплывае, // мне дамавік яшчэ сыграе, // ва ўсім астатнім – Бог суддзя» [12, с. 228].

Паэтэсы ўсведамляюць грахоўнасць гэтага свету, недасканаласць чалавечай прыроды. Лірычная гераіня Г. Каржанеўскай блукае ў пошуках таго, «што з'яўляецца // Сведчаннем Бога». Але, на жаль, яна бачыць падчас на тварах «толькі шэрань бяздум'я // і тла» [6, с. 66]. Чаму адварочваецца ад нас Усявышні? Здаецца, сапраўды Бог карае чалавека, які «за вякі // Расчараваў Тварца неверагодна». Аднак, «Што чалавек без людскасці і веры? // Без зерня колас, лямпа без святла» [6, с. 89]. Г. Каржанеўская бачыць бяду сучаснага грамадства ў мітусні: «Калі праца становіцца богам, // Тады Бог адварочвае зрок. // Часу мала, // а тлуму так многа...» [6, с. 5]; да гэтага грэху далучаецца яшчэ адзін: «Касназычам захлынуўся свет. // І сам сябе не слухае даўно ўжо. // Даруй і адратуй нас, Божа» [6, с. 62].

Паводле М. Лоскага, «задача чалавека як разумнай істоты заключана ў пераадоленні ўсіх праяў зла і недасканаласці, якія з'яўляюцца вынікам грахоўнасці і звязаны з рэчыўнасцю. Чалавек павінен удасканальваць працэс яднання ўсіх істот з Богам. Але ѐн не можа гэта зрабіць, не прынѐсшы сябе ў ахвяру дзеля любові да Бога і ўсяго свету» [14, с. 134]. Беларускія паэтэсы звяртаюцца да чытачоў з напамінам аб духоўным і маральным самаўдасканаленні, аб існаванні вечных каштоўнасцей. Н. Мацяш заклікае помніць пра вечнае: «О, калі б кожны памятаў, што вечны ѐн! // ...Што побыт наш зямны – ўсяго луска...» [9, с. 232]. Вера пазбаўляе чалавека страху перад невядомасцю і смерцю. Памірае цела чалавека, душа вызваляецца для вечнага жыцця. «Калі чалавек у зямлю сыходзіць, // Вылушчваецца з яго // Зерне Духу» [9, с. 230], – робіць выснову Н. Мацяш. Яна верыць у бессмяротнасць: «Бяссмертны ты, і я не ўмру» [10, с. 239].

У трыпціху «Тры каласкі любові і смутку» яна піша: «Смерць – яна не ў кожным разе драма... // Родны дол абдымкі расхіне, // І ступлю я ў ростул Вечнай Брамы...» [9, с. 278].

Г. Булыка неаднаразова паэтызуе ў сваіх творах судны час, калі чалавек прадстане перад Богам: «А над плыннай скрозьдоннасцю чорнай // Судны дзень прабяжыць басаною» (верш «Мост») [15, с. 26], «Між пеклам і раем // стамоўны // разгубіцца крык» [15, с. 34], да аднаго са сваіх вершаў, які пачынаецца са слоў: «Судны дзень...» паэтэса бярэ эпіграфам радкі з Апакаліпсісу: 6, 8: «І я паглядзеў, і вось конь бледны, // а на ім вершнік, якому імя // смерць. // І пекла ішло за ім» [15, с. 73].

Такім чынам, беларускія паэтэсы абуджаюць чалавечую духоўнасць творамі, прасякнутымі глыбокім хрысціянскім пачуццём.

Неабходна звярнуць увагу на слова-зварот да Бога, малітву. У беларускай «жаночай» паэзіі такіх зваротаў вельмі шмат. Да жанру малітвы далучыліся Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Т. Бондар, Г. Каржанеўская і інш. Пісьменнікі валодаюць універсальным інструментам для перадачы ўсёй разнастайнасці як унутранай, так і знешняй рэальнасці. Невыпадкова Евангелле ад Іаана пачынаецца так: «Ад пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог» [16, с. 100]. «Вартасць слова вымяралася яго карыснасцю для душы і ўнутранага ўзвышэння. Перавага апавядальнага і павучальнага элементаў спрычынілася да ўзнікнення ў старажытнарускім пісьменстве спецыфічнай тэалагічнай пазіцыі. Зварот да пачуцця і волі ў ёй непараўнальна мацнейшы за спробы выказаць рэлігійны змест праз паглыбленую рэфлексію» [17, с. 5]. У вершаваных маленнях паэтэсы просяць аб вечным, неўміручым, высокадухоўным як асабіста для сябе, так і для чалавека ўвогуле. Праўда, спачатку Я. Янішчыц не ўсе свае малітвы прысвячае Богу: «Яшчэ малюся труднай долі» [18, с. 210], «У звечарэлай скрусе, // Калі святлу малюся...» [18, с. 89], часам яе лірычная гераіня апынаецца ў роспачы: «Як знаць: каго

мне прывячаць, // Каму ўслед маліцца» [19, с. 74], але ѐсць сярод іх і прамыя звароты да Бога: «О Божа, няпраўда, што свята // Ў мяне засталося на чвэрць» [18, с. 58], а ў іншым вершы лірычная гераіня Я. Янішчыц моліцца нават за сінічку, якую выратаваў яе каханы: «О дай ѐй, Божа, сілы // І праз няроўны час // Да самае магілы // Любіць і слухаць Вас» [18, с. 47].

Н. Мацяш свой верш «Калі б на свеце меўся Бог» будуе ў форме пераказу вядомай малітвы, з захаваннем прынцыпу траічнасці: «– О Божа, дай мне сілы не змяняць // Таго, чаго змяніць не ў сіле я; // – І дай мне мужнасці зрабіць усѐ, // Што я ў жыцці маім зрабіць павінна; // – І дай мне мудрасці, каб разлічыць, // Што – не пад сілу мне, а што – мой абавязак...» [9, с. 64]. У вершы «Гуканне ў пустыні» паэтэса звяртаецца да Бога з просьбай паказаць сваѐ аблічча: «З’явіся, Збаўца мой, з’явіся! // <...> З’явіся, выбаў з утрапення! // І хай хвілінай той святой // Усѐ, што імкнецца да здзяйснення, // Па веры спраўдзіцца маѐй» [9, с. 219]. У вершы «Пасля» Н. Мацяш хвалюецца за будучых людзей, наступнікаў, просіць для іх у першую чаргу веры: «Дай чалавеку веры, Божа, // Што хоць пасля, пасля, пасля, // Ужо ў абліччы іншым, можа, // Ён быць папраўдзе шчасным зможа, – // Бо вопыт, горкі і варожы, // Якім сілкуе Дух зямля, // Яму стаць мудрым дапаможа // Хоць недзе, некалі, пасля...» [9, с. 239]. Паўтор слова «пасля» надае спакой, урачыстасць, нават нейкую ўпэўненасць гэтаму малітоўнаму звароту да Бога.

Малітва надзелена магутнай сілай. Як піша У. Салаўѐў, «верыць у божыя вытокі дабра і маліцца Яму, аддаючы Яму сваю волю ва ўсім, ѐсць сапраўдныя мудрасць і пачатак маральнай дасканаласці» [20, с. 5]. Сапраўды, у малітве чалавек яднаецца з Найвышэйшым, знаходзіць пакаянне ў грахах, пераадоленне спакусы, утаймаванне гневу. Да малітвы спрадвеку чалавек прыходзіць у самыя адказныя моманты жыцця. Ю. Лабынцаў адзначае, што ў малітвы, як пэўнага слоўнага жанру, «шмат агульнага з развітай літаратурай сучаснасці, з мастацкай творчасцю. Агульнага шмат, вельмі шмат. Бо сама паэзія, лірыка нарадзілася з гімна, з малітвы, малітоўнага імпульсу. Малітва –

гэта высокая духоўная творчасць. Узыходжанне» [20, с. 6]. Малітва Г. Каржанеўскай – узнѐслы зварот да Усявышняга. Паэтэса просіць у Бога: «Даруй і адратуй нас, Божа. // Дай сілу і жаданне далей жыць...» [6, с. 62]. Яна ўсведамляе, як шмат гублялі людзі, пазбаўленыя духоўнага слова. Паэтэса са шкадаваннем гаворыць пра сваѐ пакаленне: «Шкада, што не навучаны маліцца, // Атэістычны ачмурыў нас чад» [6, с. 88]. Сама паэтэса робіць спробу тварэння малітвы ў аднайменным вершы: «Атулі мяне ласкай сваѐю – // Як шчытом, ад бяды заслані. // Накіруй на дабро мае дні...» [6, с. 114].

Для Т. Бондар малітва – гэта шлях да выратавання: «Вось і малюся, і ратую // Душу сваю і цішыню» [21, с. 60], паэтэса нават дае параду, як лепш маліцца: «Сам-насам з цішынѐй // Маліцца лепей, // І толькі ў працы // Разагне спіну // З палѐгкаю душа...» [21, с. 58].

Н. Мацяш таксама звяртаецца да ўласна жанру малітвы – «Малітва Апанаса Філіповіча». У вусны асветніка і рэлігійнага дзеяча паэтэса ўкладвае словы звароту-просьбы да Маці Божай, Царыцы Нябеснай. У вершы вытрымліваюцца каноны жанру: тут ѐсць і зварот-велічанне святой, і самапрыніжэнне таго, хто моліцца: «Узры мя, // Сляпога сярод сляпых, // Пачуй мя, // Глухога сярод глухіх <...> Прачыстая Дзева, // Убогіх заступніца, // Маркотных суцешніца...» [9, с. 287]. А моліцца лірычны герой за сваю Радзіму, свой народ. Заканчваецца верш кананічным малітоўным словам – «Амін».

Такім чынам, маральна-хрысціянскія ідэалы склалі аснову мастацкага светаразумення беларускіх паэтэс, якія пераасэнсоўвалі вечныя ісціны і катэгорыі быцця, пры гэтым адбываўся працэс самапазнання, паглыблення маральна-гуманістычнага зместу іх лірыкі. Любоў у паэзіі Н. Мацяш, Т. Бондар, Г. Каржанеўскай і інш. набывае хрысціянскае гучанне, у іх вершах увасобілася разуменне таго, што хрысціянская вера – крыніца маральнага ўдасканалення і духоўнага ўзбагачэння. У паэтэс пакалення 50–60-х гг. XX стагоддзя гуманістычная

традыцыя менш асвечана рэлігійнасцю, у адрозненне ад паэтэс больш маладога пакалення – Н. Мацяш, Т. Бондар, Г. Каржанеўскай, у паэзіі якіх «абвастрыліся рэлігійна-хрысціянскія матывы» [22, с. 31], ѐсць шчырыя звароты да Бога, жанр верша-малітвы. Аўтарская манера Н. Мацяш, Т. Бондар, Г. Каржанеўскай, Г. Булыкі вызначаецца экзістэнцыяльнай заглыбленасцю і духоўна-рэлігійным зместам.

*Спіс літаратуры*


1. Жураўлѐў, В. П. У пошуку духоўных ідэалаў: на матэрыяле беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст. / В. П. Жураўлѐў ; НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; пад рэд. У. В. Гніламѐдава. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 191 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. Т. 3 : 1955–1965 гг. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У. В. Гніламѐдаў, С. С. Лаўшук. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 952 с.

3. Анціпенка, А. Еўрапейскасць і хрысціянская ідэя беларускасці / А. Анціпенка // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 2 : Фарміраванне і развіццѐ нацыянальнай самасвядомасці беларусаў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Маладзечна, 19–20 жн. 1992 г. – Мінск, 1993. – С. 259–262.

4. Века, А. «На Беларусі Бог жыве...»: біблейскія сюжэты і матывы ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча / А. Века // Роднае слова. – 1995. – № 11. – С. 23–35.

5. Радзік, Р. Рэлігійныя перадумовы фарміравання беларускай нацыі / Р. Радзік // Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 2 : Фарміраванне і развіццѐ нацыянальнай самасвядомасці беларусаў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Маладзечна, 19–20 жн. 1992 г. – Мінск, 1992. – С. 272–279.

6. Каржанеўская, Г. Асенні мѐд : вершы розных гадоў / Г. Каржанеўская. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 159 с.

7. Лось, Е. Выбраныя творы : у 2 т. / Е. Лось. – Мінск : Маст. літ., 1979. – Т. 1 : Вершы. – 320 с. ; Т. 2 : Вершы, паэмы. – 320 с.

8. Лось, Е. Лірыка / Е. Лось. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 175 с.

9. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой : вершы і паэмы (1962–1992) / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 301 с.

10. Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць : выбр. лірыка / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 461 с.

11. Бердяев, Н. А. Философия творчества, культуры и искусства : в 2 т. / Н. А. Бердяев. – М. : Искусство, 1994. – Т. 1. – 542 с.

12. Баравікова, Р. А. Дрэва для райскай птушкі : лірыка / Р. А. Баравікова ; прадм. І. Штэйнера. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 270 с.

13. Баравікова, Р. А. Сад на капялюшыку каханай : лірыка / Р. А. Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 486 с.

14. Лосский, Н. О. История русской философии / Н. О. Лосский. – М. : Высш. шк., 1991. – 559 с.

15. Булыка, Г. Турмалін : вершы / Г. Булыка. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 94 с.

16. Библия: книга Священного Писания Ветхого и Нового Завета конон. в рус. пер. с парал. местами. – Минск : Изд-во им. Ф. Скорины, 1994. – 1198 с.

17. Грыневіч, В. Пасхальныя матывы ў творах сьв. Кірылы Тураўскага / В. Грыневіч. – Ворша – Lublin – Харків : Слово, 1997. – 39 с.

18. Янішчыц, Я. Пачынаецца ўсѐ з любві... : вершы, паэмы / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 339 с.

19. Янішчыц, Я. Ясельда : лірыка / Я. Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 1978. – 126 с.

20. Лабынцаў, Ю. А. «Напой росою благодати…» : малітоўная паэзія Кірыла Тураўскага / Ю. А. Лабынцаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 237 с.

21. Бондар, Т. Хачу назваць цябе каханым : вершы, лісты розных гадоў / Т. Бондар. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 269 с.

22. Шматкова, І. І. Беларуская жаночая паэзія другой паловы XX стагоддзя / І. І. Шматкова. – Мінск : РІВШ, 2017. – 144 с. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/187738/1/Bel_zhan_poesia_20.pdf. – Дата доступу: 31.10.2020.

***Шматкова Ирина Игоревна***, Белорусский государственный университет, г. Минск, Республика Беларусь.

**Iryna Shmatkova**
Belarusian State University
e-mail: i.shmatkova@gmail.com

## CHRISTIAN IMAGES AND MOTIVES IN THE WORKS OF BELARUSIAN POETESSES OF THE SECOND HALF OF THE XX CENTURY

The article examines the embodiment of Christian images and motives in the works of Belarusian poetesses of the second half of the $20^{th}$ century

(J. Yanishchits, N. Matyash, T. Bondar, G. Korzhenevskaya, etc.). The lyrics of the authors under consideration embody the understanding that the Christian faith is a source of moral improvement and spiritual enrichment, their works contain sincere appeals to God, the genre of a prayer-poem.

*Keywords:* poetry, Belarusian poetesses, Christian images, faith, spirituality, morality.